*М.А. ПАПОЎ*

# ГІСТАРЫЧНЫЯ ПРАЦЫ МІТРАПАЛІТА СТАНІСЛАВА БОГУША-СЕСТРАНЦЭВІЧА (1731–1826)

Анализируются труды римско-католического митрополита Станислава Богуша-Сестренцевича (1731–1826), посвященные изучению истории Крыма, проблеме происхождения славян и становлению у них государственности. Отмечается, что Беларусь для Сестренцевича являлась только составной частью России, которая входила в ее состав с начала формирования у славян государственности.

The article analyses the scholarly works of a roman catholic metropolitan Stanislav Bohush-Siestrentsewich (1731–1826), devoted to the history of Crimea, the origin of Slavs and the development of their statehood. It is being shown that Siestrentsevich associated Belarus as an integral part of Russia since the beginning of Slavic statehood formation.

Штодзённая, часта руцінная праца па кіраванні самай вялізнай каталіцкай царкоўнай правінцыяй у свеце, пастарскія абавязкі і ўдзел у прыдворным этыкеце ўсё ж не змаглі перашкодзіць Станіславу Богушу-Сестранцэвічу быць у цэнтры інтэлектуальнага жыцця Расійскай імперыі.

Член Імператарскай акадэміі навук, старшыня Вольнага эканамічнага таварыства, ганаровы член Вольнага таварыства аматараў расійскай славеснасці, Варшаўскага і Рыжскага таварystваў сяброў навук, Кракаўскага навуковага таварыства, ганаровы прафесар Маскоўскага, Віленскага, Кракаўскага, Дэрпцкага, Абоскага універсітэтаў, Санкт-Пецярбургскай медыка-хірургічнай акадэміі і Лонданскай агранамічнай асацыяцыі – вось далёка няпоўны пералік навуковых і грамадскіх тытулаў магілёўскага мітрапаліта. Інтэлектуальны свет ведаў яго як прапаведніка, паэта, драматурга, перакладчыка, філолага і, вядома, гісторыка.

На жаль, на сённяшні дзень няма даследаванняў, прысвечаных аналізу навуковых прац магілёўскага мітрапаліта. Асобныя звесткі пра гістарычныя працы С. Богуша-Сестранцэвіча сустракаюцца ў даследаваннях А. Старчэўскага[1], В.А. Францава[2], І.В. Ягіча[3], Р. Валашыньскага[4], І.У. Тункінай[5].

Як гісторыка, магілёўскага мітрапаліта цікавілі тры цесна пераплеценыя паміж сабою праблемы: гісторыя Крыма, паходжанне славян і праблема станаўлення ў іх дзяржаўнасці.

Вядома, што маніфест 8 красавіка 1783 г. азнаменаваў сабою ўключэнне ў склад Расійскай імперыі Крыма. Новарасійскім генерал-губернатарам быў прызначаны Рыгор Пацёмкін, які адразу ж развіў бурную дзейнасць па арганічным уключэнні новадалучаных зямель у склад метраполіі.

Адным з кірункаў гэтай дзейнасці было гісторыка-геаграфічнае вывучэнне новых тэрыторый.

17 (28) студзеня 1782 г. Кацярына II падпісала ўказ, згодна з якім у межах Расійскай імперыі была створана Магілёўская архіепархія, галавою яе з'яўляўся Станіслаў Сестранцэвіч. Гэты ўказ павінен быў перадаць Рыгор Пацёмкін. Той вызваў новапрызначанага архіепіскапа ў Херсон, і вясной 1783 г. С. Сестранцэвіч рушыў у шлях. У Крамянчугу ён сустрэўся з усемагутным фаварытам. А. Старчэўскі піша аб тым, што, верагодна, падчас адной з сустрэч Р. Пацёмкін, уражаны эрудыцыяй рымска-каталіцкага іерарха, прапанаваў таму напісаць «гісторыю нованабытай краіны»[6]. Неўзабаве ў Магілёўскай друкарні С. Сестранцэвіча была выдадзена драма ў вершах «Гіцыя ў Таўрыдзе», трагедыя, напісаная аўтарам «Гісторыі Таўрыды». Нягледзячы на тое, што загаловак кнігі дазваляе сцвярджаць ужо аб існаванні даследавання па гісторыі Крыма, трэба лічыць апошнія словы назвы толькі анонсам хуткага з'яўлення працы. Аднак, «маючы па… пасадзе мала вольных часоў»[7], магілёўскі мітрапаліт здолеў завяршыць сваю працу толькі праз 17 гадоў. У 1800 г. у горадзе Брунсвік (Браўншвейг) убачыла свет двухтомнае даследаванне на французскай мове «Histoire du royaume de la Chersonèse Taurique» («Гісторыя царства Херсонскай Таўрыды»)[8], якое ў 1806 г. было перавыдадзена на рускай[9]. Праца складаецца з 16 кніг і ахоплівае перыяд са старажытных часоў да 1783 г. – года ўключэння Крыма ў склад Расійскай імперыі, але, нягледзячы на агромністы факталагічны матэрыял, сабраны ў гэтай працы, даследаванне з'яўляецца толькі пераказам прачытаных аўтарам крыніц, вельмі часта нагадвае хутчэй гістарычную фантастыку, чым навуковую манаграфію. На карысць «Гісторыі Таўрыды» можна прывесці толькі словы І.У. Тункінай, якая адзначыла, што «нягледзячы на кампілятыўны характар і поўную адсутнасць крытыкі выкарыстаных аўтарам крыніц… гэтая кніга з'явілася адным з першых зводных пераказаў наратыўнай традыцыі аб паўночным узбярэжжы Понта»[10].

Другой праблемай, што найбольш хвалявала Станіслава Сестранцэвіча, было пытанне аб паходжанні славян. У XVII–XVIII ст. у Рэчы Паспалітай асабліва папулярнай была сармацкая тэорыя, згодна з якой прарадзіму славян трэба было шукаць у Сармацыі (гэта значыць, у Паўночным Прычарнамор'і). С. Богуш-Сестранцэвіч не быў выключэннем. Працуючы над «Гісторыяй Таўрыды», ён зацікавіўся доказам таго, што прамымі продкамі славян былі сарматы.

Яшчэ 18 студзеня 1785 г. ён напісаў ліст да архіепіскапа Яўгена (Булгарыса) з просьбай растлумачыць, на якой мове размаўлялі сарматы. Праз месяц (25 лютага 1785 г.) архіепіскап Яўген, які знаходзіўся ў той час у Херсоне, адказаў у пісьме-трактаце, што сарматы размаўлялі на славянскай мове[11].

У 1810 г. кароткі змест напрацаванага С. Сестранцэвічам матэрыялу быў надрукаваны на французскай мове ў «Кароткім пераліку гістарычных даследаванняў аб вытоках сарматаў, эсклавонаў і славян»[12].

У жніўні 1811 г. С. Сестранцэвіч планаваў апублікаваць у Вільні на польскай мове «Эпоху хросту сарматаў, склавінаў і вытокі гэтых народаў» («Epochy chrztu Sarmatów, Skławinów i początków tych narodów»), аднак яна па нейкіх невядомых прычынах не была надрукавана. Верагодней усяго, рукапіс гэтай працы пад некалькі іншым загалоўкам «Гістарычныя даследаванні аб паходжанні славян, а таксама літоўскага народа і яго князёў і эпох прыняцця імі хрысціянскай веры» захоўваецца ў бібліятэцы Чартарыйскіх у Кракаве.

Нарэшце вынік яго 25-гадовага пошуку быў надрукаваны ў «Гістарычных даследаваннях аб паходжанні славян ці эсклавонаў і сарматаў і эпох прыняцця імі хрысціянства»[13].

Калі аддзяліць часта супярэчныя адна адной звесткі і занадта яўнае фантазёрства, то асноўныя вынікі, да якіх прыйшоў аўтар, магчыма акрэсліць наступнымі тэзісамі: 1) славяне з'яўляюцца прамымі патомкамі сарматаў; 2) продкамі сарматаў з'яўляюцца мідзяне; 3) скіфы, што напалі на Мідзію ў сярэдзіне II тыс. да н. э., увялі частку мідзян на берагі Танаіса (Дона); 4) у старажытнагрэчаскай літаратуры гэтыя палонныя атрымалі назву саўраматы; 5) з цягам часу сарматы заваявалі агромністыя тэрыторыі ад Дона да Эльбы і Дуная; 6) мова, на якой размаўлялі сарматы, – санскрыт, на аснове якога сфарміраваліся ў тым ліку «славянскія» і «літоўскія» мовы.

Адначасова з вывучэннем праблемы этнагенезу славян Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч прыходзіць да высновы аб існаванні некалі адзінай усходнеславянскай дзяржавы (Русь), у склад якой уваходзілі ў тым ліку беларускія і ўкраінскія землі (Заходняя Расія). Адзначым, што для яго тэрміны «Русь» і «Расія» былі сінанімічныя. Фактычна магілёўскі мітрапаліт стаяў на пазіцыях «заходне-русізма». Свае ідэі ён выразіў у працы «Аб Заходняй Расіі»[14], якая з'яўляецца своеасаблівым папулярным даведачным дапаможнікам па гісторыі ўсходніх славян да XIII ст. У першым раздзеле аўтар выказвае погляды на праблему паходжання славян, іх прарадзімы, этымалогіі этнонімаў славянскіх плямёнаў, а таксама працэсаў утварэння ў іх дзяржаўнасці. Наступныя раздзелы фактычна ўяўляюць сабой шэраг невялікіх нататкаў аб найбольш значных гарадах удзельных княстваў Заходняй Русі.

Паводле С. Сестранцэвіча, славяне з'яўляюцца патомкамі сарматаў, што некалі жылі паміж Донам і Віслай. З цягам часу іх адцяснілі на поўнач іншыя плямёны, сярод якіх былі і энеты (венеды). Менавіта ўзаемная асіміляцыя сарматаў і венедаў стала асновай для будучага славянскага этнасу, які пачаў фарміравацца ў раёне р. Дунай. У V ст. н. э. славяне былі выцеснены адтуль валахамі і хазарамі. У залеж-

насці ад найбольш характэрных асаблівасцей рэльефу мясцовасці, дзе яны пражывалі, славянскія плямёны атрымалі этнонімы. Славяне, што пасяліліся «на правым, высокім беразе Дняпра, насупраць упадаючай у яго Дзясны», атрымалі назву «кіяўляне» (ад фінскага «кы» – горац, жыхар гор). Славян, якія пасяліліся на поўнач ад кіяўлян аж да р. Прыпяць, сталі называць драўлянамі (жыхарамі лясоў). На тэрыторыі, абмежаванай Прыпяццю, Дзвіной, Беразіной, Нёманам, Бугам і Дняпром, сталі жыць дрыгавічы, за Дзвіной, каля р. Палота, – палачане, каля Смаленска, на «крывой», перасечанай мясцовасці пасяліліся крывічы. Радзімічы, што прыйшлі ў міжрэчча Дняпра і Сожа, прынеслі разам з сабою і асабісты этнонім у памяць аб радзіме (Радомль на Вісле) і сваім правадыры. У Карпатах пасяліліся «горпады» (ці белыя харваты), уздоўж р. Марава – маравяне, дзе р. Варта ўтварае «лэнк», – ленчане. Ляхамі сталі называцца славяне, якія жылі каля р. Віслы і прынялі хрысціянства лацінскага (ляцкага) абраду. Палякамі сталі называцца плямёны, што пасяліліся ў «палях» каля Віслы і на левым беразе Дняпра. Этнонімам «чэхі» сталі называцца славянскія плямёны, якія жылі на захадзе за Віслай і Татрамі.

Пачатак расійскай дзяржаўнасці С. Сестранцэвіч адносіць да 862 г., калі, выконваючы перадсмяротную просьбу пасадніка Гостамысла, жыхары Вялікага Ноўгарада паклікалі яго ўнукаў (сыноў «варага-рускага караля» Фінляндыі) Рурыка і яго двух братоў. Рурык прыняў тытул Вялікага князя Рускага. Пры яго сыне Ігары сталіца Русі была перанесена ў Кіеў. Перыяд «грамадзянскіх войн», які пачаўся пасля смерці Уладзіміра І і доўжыўся 200 гадоў, прывёў да заваявання Русі татарамі. Менавіта татарскае іга прывяло да таго, што некалі адзіная Русь была разарвана на часткі яе суседзямі.

Сёння праца не ўяўляе навуковай вартасці. Яна з'яўляецца толькі адным з бібліяграфічных прыкладаў станаўлення ідэй «заходне-русізма» на беларускіх землях і крыніцай, дазваляючай ахарактарызаваць бачанне магілёўскім мітрапалітам мінулага рускіх, беларусаў і украінцаў.

Зноў праблема станаўлення дзяржаўнасці на ўсходнеславянскіх землях была закранута С. Сестранцэвічам амаль праз чвэрць стагоддзя ў 1818 г. у «Даследаванні аб паходжанні рускага народа»[15]. Разважанні аўтара цалкам пабудаваны ў рамках «нарманскай тэорыі» паходжання дзяржавы ва ўсходніх славян.

Меркаванні сучаснікаў аб Станіславе Сестранцэвічы як гісторыку былі супрацьлеглымі. Шмат у чым на іх характарыстыку паўплывала тое становішча, якое займаў магілёўскі мітрапаліт у расійскай бюракратычнай эліце, і тыя палітычныя погляды, якімі надзялялі яго сучаснікі.

28 сакавіка 1815 г. мітрапаліт Яўген (Булгарыс) злосна ўсклікнуў Анастасевічу: «Калі вы прачытаеце Сестранцэвічаву гісторыю аб скіфах, то паведамце мне сваё меркаванне. Калі гэтая кніга падобна да "Гісторыі аб Таўрыі", па заслугах зганенай нябожчыкам Шлёцэрам, то невялікае прырашчэнне да літаратуры. Я чытаў гэтую гісторыю: бязладную, бяздоказную (бо многія цытацыі надта ілжывы і пазбіраны яму рознымі езуітамі, а не самім ім), шмат у чым няпоўную, а ў большасці неналежным напоўненую, з многімі дзіўнымі ў гісторыі парадоксамі і г. д. Я выходзіў часам з цярплівасці. Гэта не лепш вычварных кніг Патоцкага»[16]. Меркаванне праваслаўнага іерарха яшчэ далей развіў Зар'ян Даленга-Хадакоўскі, які, аналізуючы гістарычныя працы магілёўскага мітрапаліта, таксама не вытрымаў і напісаў: «…як у лесе пасля пажару, не знайшоў ані грыбка, не адно выказванне не насыціла мяне»[17].

І ў той жа час у абарону гістарычных прац Станіслава Сестранцэвіча выступілі чэшскі славіст Ю. Даброўскі, прафесар Віленскага універсітэта Ян Лабойка, расійскі гістарыёграф А. Старчэўскі. Іх характарыстыкі магчыма аб'яднаць у ёмістым выказванні апошняга: «У нашай гістарычнай літаратуры пачатку XIX стагоддзя Сестранцэвіч павінен займаць першае месца пасля Карамзіна»[18]. Другі не менш знакаміты гісторык і прафесар І. Лелявель, згадваючы гістарычныя даследаванні магілёўскага мітрапаліта, нейтральна заўважыў: «…уяўляюць яны, так скажу, старадаўні спосаб, аб'яднаны з новым стылем. Шмат у іх да чытання, а даследаванне не заўсёды ад сумнення ў правільнасці вольнае, не заўсёды пазбаўлена ад супярэчнасцей…»[19]

Такім чынам, Станіслаў Богуш-Сестранцэвіч пакінуў пасля сябе параўнальна вялікі багаж з мастацкіх і навуковых прац (17 апублікаваных і неапублікаваных). Пяць з іх прынята адносіць да навуковых даследаванняў на гістарычную тэматыку. Як гісторык, С. Сестранцэвіч не ўнёс у гістарычную навуку нічога новага. Яго працы хутчэй нагадваюць гістарычную фантастыку, чым навуковую манаграфію. Але ён па праву можа лічыцца адным з лепшых папулярызатараў мінулага ў Расійскай імперыі пачатку XIX ст. Беларусь, на яго думку, з'яўляецца толькі састаўной часткай Расіі, што ўваходзіла ў яе склад з пачатку фарміравання ў славян дзяржаўнасці, і толькі дзякуючы татарскаму ігу на некаторы час была адарвана ад яе.

[1] Гл.: Старчевский А. Русская историческая литература в первой половине XIX века. Карамзинский период с 1800–1825 год // Библиотека для чтения. 1852. Т. 112. С. 49–108.

[2] Гл.: Францев В.А. Польское славяноведение конца XVIII и первой четверти XIX ст. Прага, 1906.

[3] Гл.: Ягич И.В. История славянской филологии. СПб., 1910.

[4] Гл.: Wołoszyński R.W. Polsko – rosyjskie związki w naukach społecznych 1801–1830. Warszawa, 1974.

[5] Гл.: Тункина И.В. Русская наука о классических древностях юга России (XVIII – сер. XIX в.). СПб., 2002.

[6] Старчевский А. Указ. тв. С. 57–58.

[7] Богуш-Сестренцевич С. История о Таврии. СПб., 1806. Т. I. С. 7.

[8] Гл.: Bohusz-Siestrzeńcewicz S. Histoire du royaume de la Chersonèse Taurique. Brunswick, 1800. Vol. I–II.

[9] Гл.: Богуш-Сестренцевич С. История о Таврии. СПб., 1806. Т. I–II.

[10] Тункина И.В. Указ. тв. С. 42.

[11] Гл.: Богуш-Сестренцевич С., Евгений (Булгарис). Письмо преосвященного Станислава Сестренцевича, архиепископа Могилевского, к преосвященному Евгению, архиепископу Булгарскому, и ответ сего святителя о том, что древние сарматы говорили языком славянским // Вестн. Европы. 1805. Ч. 21. № 9 (май). С. 3–23. Старчевский А. Указ. тв. С. 58–68.

[12] Гл.: Bohusz-Siestrzeńcewicz S. Sommaire de recherches historiques sur les origines des Sarmates, des Esclavons et des Slaves. Mohilew, 1810.

[13] Гл.: Bohusz-Siestrzeńcewicz S. Recherches historiques sur l'origine des Slaves ou Esclavons et des Sarmates et sur les époques de la conversion de ses peoples au Christianisme. St. Petersbourg, 1812. Vol. 1–4.

[14] Гл.: Bohusz-Siestrzeńcewicz S. O Rossyi Zachodniey niegdyś z Państwem Rossyiskim złączoney, potym zaś w smutnych czasach oderwaney. Mohilew nad Dnieprem, 1793.

[15] Гл.: Богуш-Сестренцевич С. Исследование о происхождении русского народа. СПб., 1818.

[16] Евгений (митрополит). Письмо Анастасевичу от 28 марта 1815 г. // Русский архив. 1889. Т. 5. С. 43. Францев В.А. Указ. тв. С. 71–72.

[17] Wołoszyński R.W. Op. cit. S. 300.

[18] Старчевский А. Указ. тв. С. 75.

[19] Lelewel J. Narody na ziemiach sławiańskich, przed powstaniem Polski // Lelewel J. Polska, jej dzieje. Poznań, 1853. T. 1. S. 500; Wołoszyński R.W. Op. cit. S. 299.

Паступіў у рэдакцыю 28.12.05.

***Міхаіл Аляксандравіч Папоў*** – выкладчык кафедры філасофіі і паліталогіі БДМУ.